*Рыхтуемся да тэсціравання*

# КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ Ў 2007/2008 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

## ЛЕКСІКАЛОГІЯ

### ТЭСТ 1

ЛЕКСІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ І СПАЛУЧАЛЬНАСЦЬ СЛОЎ

**А1. Адзначце пары слоў, якія адрозніваюцца лексічным значэннем:**

☐ 1) батанік – батанічны
☐ 2) глядзець – глядзелі
☐ 3) дзверы – дзверцы
☐ 4) крыжак – крыжаносец
☐ 5) крылаты – крылатка

**А2. Адзначце пары слоў з аднолькавым лексічным значэннем:**

☐ 1) байдарка – байдарачны
☐ 2) абалона – абалонь
☐ 3) багна – дрыгва
☐ 4) важкі – важны
☐ 5) газоўка – газніца

**А3. Адзначце азначэнні, у якіх правільна ўказана лексічнае значэнне слова:**

☐ 1) гараскоп – 'навука аб нябесных целах'
☐ 2) тыдзень – 'адрэзак часу ў сем дзён'
☐ 3) вернісаж – 'спектакль у гонар або на карысць аднаго з яго ўдзельнікаў'
☐ 4) гумор – 'добры, душэўны настрой'
☐ 5) весніцы – 'вароты ў двор або агарод, у поле'

**А4. Адзначце азначэнні, у якіх няправільна ўказана лексічнае значэнне слова:**

☐ 1) герб – 'эмблема дзяржавы, горада, якая змяшчаецца на сцягах, дзяржаўных дакументах і інш.'
☐ 2) еднасць – 'адзінства, згуртаванасць, супольнасць'
☐ 3) дратва – 'металічны выраб у выглядзе гібкай ніці'
☐ 4) жарства – 'буйны калючы пясок'
☐5) мятліца – 'пучок звязаных галінак для падмятання'

**А5. Адзначце словазлучэнні, у якіх парушана лексічная спалучальнасць слоў:**

☐ 1) адборачная пшаніца
☐ 2) напісаць натацыю ў газету
☐ 3) камандны пункт
☐ 4) пранікальныя словы
☐ 5) лічбавы код

**А6. Адзначце словазлучэнні з правільнай лексічнай спалучальнасцю слоў.**

☐ 1) дамавáя ежа
☐ 2) ягаднікавы куст
☐ 3) юнатаўскі гурток
☐ 4) яблычны сад
☐ 5) тварожны сыр

**А7. Адзначце сказы, у якіх не парушана лексічная спалучальнасць слоў:**

☐ 1) Днём камандзір быў на тактоўных занятках у першым батальёне.
☐ 2) Работа – самыя дзейныя лекі ад усякага суму.
☐ 3) Пры сустрэчы з калегам ён надаваў свайму твару таямнічы выгляд.
☐ 4) Лён доўга стаяў на покуці – высокі, сцяблісты, жоўты, як воск.
☐ 5) Мова паэта, яго слоўнікавы запас здзіўляюць сваім багаццем і сваёй разнастайнасцю.

**А8. Адзначце сказы, у якіх парушана лексічная спалучальнасць слоў:**

☐ 1) Мянтуз слізісты, цяжка яго рукамі ўзяць.
☐ 2) Эшалон затрымліваўся на вузлаватых станцыях.
☐ 3) Раніцай прыляцеў у гарадок голуб, і ўсе адразу здагадаліся, што птушка ручная, вывучаная чалавекам.
☐ 4) Мільгаюць бярозы – астаткі даўнейшых прысад.
☐ 5) Сувязным паміж штабам і ротамі я быў увесь час, але пасыланым у штаб палка не хадзіў.

**А9. Адзначце словы, якія спалучаюцца са словам *земляны (-ая)*:**

☐ 1) вал
☐ 2) рэформа
☐ 3) арэх
☐ 4) торф
☐ 5) колер

**А10. Устанавіце адпаведнасць паміж словам і яго лексічным значэннем. Адзначце нумар правільнага адказу:**

| | |
|---|---|
| **А.** Вагавы́ | 1) 'дэкаратыўны куст з белымі пахучымі кветкамі, сабранымі ў невялікія гронкі' |
| **Б.** Язмін | 2) 'які мае адносіны да вагі' |
| **В.** Зямляк | 3) 'жыхар планеты Зямля' |
| **Г.** Вагальны | 4) 'ураджэнец адной з кім-небудзь мясцовасці' |
| | 5) 'які мае адносіны да вагання, уласцівы ваганню' |

☐ 1) А5Б1В3Г2
☐ 2) А2Б1В4Г5
☐ 3) А2Б1В3Г5
☐ 4) А5Б1В4Г2
☐ 5) А2Б1В5Г4

**В1. Закончыце фармулёўку:**

Раздзел мовазнаўства, які вывучае лексічную сістэму, слоўнікавы склад мовы і асобнае слова як галоўную адзінку – гэта ☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В2. Запішыце слова па яго лексічным значэнні:**

*'спецыяльная ўстанова, дзе стрыгуць, голяць, прычэсваюць'*

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В3. Знайдзіце і запішыце словазлучэнне з правільнай лексічнай спалучальнасцю слоў:**

1) вадзяністы млын
2) грунтоўны адказ
3) кроплі жывінкі
4) васкаваны колер

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5) дысцыплінарны вучань

□□□□□□□□□□□□□□□□□

**В4. Знайдзіце словазлучэнне, у якім парушана лексічная спалучальнасць слоў, і запішыце яго правільна:**

1) заезны двор
2) крышталі солі
3) парусінавая лодка
4) марозны дзень
5) мачтавыя сосны

□□□□□□□□□□□□□□□□□

**В5. Знайдзіце ў сказе словазлучэнне, у якім парушана лексічная спалучальнасць слоў, і запішыце яго правільна:**

Кожны раз дзяўчыне здавалася, што гэта прадвесне новай падзеі.

□□□□□□□□□□□□□□□□□

**В6. Устанавіце адпаведнасць паміж словам і яго лексічным значэннем. Адказ запішыце.**

| | |
|---|---|
| **А.** Боцман | 1) 'зялёныя ўсходы азімых пасеваў' |
| **Б.** Рунь | 2) 'земляны невысокі насып уздоўж знадворных сцен хаты' |
| **В.** Лоцман | 3) 'праваднік суднаў, дасканала знаёмы з воднымі шляхамі' |
| **Г.** Прызба | 4) 'зялёная трава, зеляніна' |
| | 5) 'малодшы камандзір, якому падначалена каманда карабля па гаспадарчых работах' |

□□□□□□□□□□□□□□□□□

## ТЭСТ 2

### АДНАЗНАЧНЫЯ І МНАГАЗНАЧНЫЯ СЛОВЫ. АМОНІМЫ. ПРАМОЕ І ПЕРАНОСНАЕ ЗНАЧЭННІ СЛОВА

**А1. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ў беларускай мове – толькі адназначныя:**

☐ 1) белы *ветразь*
☐ 2) *яркі* талент
☐ 3) *батлейкавы* тэатр
☐ 4) *цесная* дружба
☐ 5) *завесці* гутарку

**А2. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ў беларускай мове – мнагазначныя:**

☐ 1) *чыстае* сумленне
☐ 2) пясчаная *выспа*
☐ 3) аб'явіць *вымову*
☐ 4) *прыйсці* ў галаву
☐ 5) жыццёвая *дарога*

**А3. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адназначныя:**

☐ 1) А дзядзька моўчкі стаў збірацца: дастаў сякерку і свярдзёлак, пад паху сунуў ён *аполак*…

☐ 2) Прарэзала неба вясёлка дугой, *аздобіла* далі красою сваёй.

☐ 3) Дзве вялікія кучаравыя хвоі *ганарліва* выглядалі з бярэзніку.

☐ 4) Брусніцы тады смачныя, калі іх марозік *кране*.

☐ 5) Усё часцей *дзяцінства* сніцца, дзе б у дарозе я ні быў.

**А4. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы мнагазначныя:**

☐ 1) Я люблю той час, калі блізіцца *зіма*.

☐ 2) Як ні гне мароз, як ні *гладзіць*, але нічога не парадзіць.

☐ 3) Краса тайгі, шыпшыннік дзікі, пялёсткамі ўсцілае *дол*.

☐ 4) А Нёман гамоніць, сярдзіта шуміць, і коцяцца *грозныя* хвалі.

☐ 5) Толькі захісталіся верхавінкі *жаўталістых* бярозак там, дзе прабеглі хлапчукі.

**А5. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні:**

☐ 1) *мяккі* знак
☐ 2) *белы* пух
☐ 3) *вострае* слова
☐ 4) *адпусціць* жарт
☐ 5) *цёплая* вада

**А6. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні:**

☐ 1) Маўчала возера ў тумане, ды вербы *плакалі* ў цішы, на дне сінеючае твані *лілеі* вецер варушыў.

☐ 2) Не збаіцца ніхто самай *лютае* смерці, пакуль кліча ў жыццё нас матуліна сэрца.

☐ 3) Матуліны рукі нас *песцяць*, галубяць, так шчыра, як маці, ніхто нас не любіць.

☐ 4) Агорнутыя сіняватаю *смугою*, журботна пазіралі далечы і ніклі ў святле жнівеньскага сонца.

☐ 5) Толькі той заваёўвае заслужаны поспех, хто аддае творчай працы *гарачае* сэрца.

**А7. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў прамым значэнні:**

☐ 1) *разгарнуць* душу
☐ 2) *поле* дзейнасці
☐ 3) *рэдкі лес*
☐ 4) птушыная *клетка*
☐ 5) *тонкі* намёк

**А8. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў прамым значэнні:**

☐ 1) Высокія *разгалістыя* каштаны засланялі вокны першых і другіх паверхаў.

☐ 2) А ўжо быў надвячорак, у лесе пачынала *цямнець*.

☐ 3) Дуб *пражыў* у лесе гадоў трыста, не меней.

☐ 4) Для *наступных* пакаленняў пад сяўбу раллю падымем.

☐ 5) Калі сапраўдны талент *бліснe*, яго ніхто ніколі не заціснe.

**А9. Адзначце словы-амонімы:**

☐ 1) *абмінаць* – 'праязджаць, праходзіць міма каго-небудзь ці чаго-небудзь' і *абмінаць* – 'прымінаць, робячы больш шчыльным'

☐ 2) *вырай* – 'цёплы край, куды адлятаюць на зіму птушкі' і *вырай* – 'чарада пералётных птушак'

☐ 3) *набытак* – 'маёмасць, уласнасць' і *набытак* – 'тое, што набыта ў выніку вучобы, жыццёвай і працоўнай практыкі'

☐ 4) *маланка* – 'імгненны разрад атмасфернай электрычнасці' і *маланка* – 'тэрміновы выпуск бюлетэня, газеты і інш.'

☐ 5) *гладзіць* – 'лёгка праводзіць рукой па чым-небудзь' і *гладзіць* – 'прасаваць'

**А10. Адзначце мнагазначныя словы:**

☐ 1) *магутны* – 'вельмі вялікі, значны (па сіле, велічыні)' і *магутны* – 'з вялікімі вытворчымі і матэрыяльнымі магчымасцямі'

☐ 2) *мастак* – 'работнік мастацтва, жывапісец' і *мастак* – 'чалавек, які творча працуе ў якой-небудзь галіне мастацтва'

☐ 3) *завод* – 'прамысловае прадпрыемства' і *завод* – 'пуск у ход якога-небудзь механізма'

☐ 4) *правільны* – 'які не адступае ад правіл, нормаў' і *правільны* – 'які адпавядае сапраўднасці'

☐ 5) *дзьмуць* – 'веяць, гнаць паветра' і *дзьмуць* – 'з сілай выпускаць з рота струмень паветра'

**А11. Адзначце пары словазлучэнняў, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца амонімамі:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

☐ 1) *кароль* дзяржавы – *кароль* танца
☐ 2) *крытычны* артыкул – *крытычны* стан
☐ 3) *халодны* дзень – *халодны* прыём
☐ 4) *нумар* дома – эстрадны *нумар*
☐ 5) паехаў на *поўдзень* – сустрэліся ў *поўдзень*

**В1. Закончыце фармулёўку:**

Словы, якія маюць рознае лексічнае значэнне, але супадаюць або ў напісанні, або ў гучанні – гэта ...

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В2. Знайдзіце і запішыце словазлучэнне, у якім выдзеленае слова ўжыта ў пераносным значэнні:**

1) *чэрствы* хлеб
2) *глыбокая* канава
3) *калючы* дрот
4) *воўчы* след
5) *гарачая* спрэчка

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В3. Знайдзіце і запішыце словазлучэнне, у якім выдзеленае слова ўжыта ў прамым значэнні:**

1) *чыстае* сэрца
2) *корань* зла
3) *грэбень* лесу
4) *востры* аловак
5) *яркі* талент

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В4. Знайдзіце словазлучэнне, у якім прыметнік ужыты ў пераносным значэнні, і запішыце гэтае словазлучэнне:**

1) *мацнець* духам
2) *халодны* дзень
3) *цёплая* вада
4) *востры* нож
5) *нежывое* святло

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В5. Знайдзіце ў сказе словазлучэнне, у якім адно са слоў ужыта ў пераносным значэнні. Запішыце гэтае слова.**

Шум калаўрота і ціхая музыка слоў абуджаюць шчаслівыя ўспаміны.

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

## ТЭСТ 3

### АНТОНІМЫ. СІНОНІМЫ. ПАРОНІМЫ

**А1. Адзначце пары слоў, якія з'яўляюцца антонімамі:**

☐ 1) жартам – сур'ёзна
☐ 2) абанемент – абанент
☐ 3) апраўдаць – абвінавачваць
☐ 4) настольнік – абрус
☐ 5) разуты – абуты

**А2. Адзначце пары слоў, якія не з'яўляюцца антонімамі:**

☐ 1) пачынаць – пача́ць
☐ 2) раз'яднацца – аб'яднацца
☐ 3) адпраўленне – прыбыццё
☐ 4) правільна – няправільна
☐ 5) прастора – абшар

**А3. Адзначце сінанімічныя рады слоў:**

☐ 1) ваколіца, наваколле, навала
☐ 2) мужны, смелы, адважны
☐ 3) вабіць, прынаджваць, выпусціць
☐ 4) балота, дрыгва, твань
☐ 5) раўнамерна, зрэдку, рытмічна

**А4. Адзначце сказы, у якіх ёсць словы-сінонімы:**

☐ 1) Па характары Янка быў чалавек упарты, настойлівы і заўсёды даводзіў пачатак да канца...

☐ 2) Пакінем спадчыну мы для патомкаў інакшую ад той, што ўзялі ад продкаў на абломках гісторыі сваёй.

☐ 3) Я люблю знаёміцца без гідаў, без ніякіх там праваднікоў з новым горадам ці краявідам, плошчай, гмахам, засенню садоў.

☐ 4) Ён выйшаў з-пад паветкі, пачакаў госця, павітаўся з ім за руку.

☐ 5) Паднімаючыся ад зямлі, сіняя густая смуга тушыла на небе ліловую яснасць.

**А5. Адзначце дамінанту сярод прыведзеных слоў-сінонімаў:**

☐ 1) мілавідны
☐ 2) прыгожы
☐ 3) маляўнічы
☐ 4) дзівосны
☐ 5) абаяльны (сімпатычны)

**А6. Адзначце рады слоў, у якіх усе сінонімы выражаны прыметнікамі:**

☐ 1) гнявіць, злаваць, абураць
☐ 2) імгла, смуга, мроіва
☐ 3) збірацца, групавацца, сыходзіцца
☐ 4) сумесны, супольны, калектыўны
☐ 5) халодны, марозны, стылы

**А7. Адзначце рады слоў, у якіх усе сінонімы выражаны дзеясловамі:**

☐ 1) убачаны, напатканы, сустрэты
☐ 2) сачыць, цікаваць, сцерагчы
☐ 3) хістацца, вагацца,ківацца
☐ 4) світаць, днець, шэрань
☐ 5) дранцвець, млець, пруцянець

**А8. Адзначце сказы, у якіх антонімы выражаны назоўнікамі:**

☐ 1) У бары, як прад бураю ціша, нават вецер не шасне крылом.

☐ 2) Вайсковы люд і люд цывільны вакзалы поўнілі сабой.

☐ 3) Між бухматых лапаў ялін праглядвала хмарнае неба, і скрозь плыў, то цішэў, то мацнеў, нудны лесавы шум.

☐ 4) Тыя, хто рассейвае не яднанне, а раз'яднанне, не ўсведамляюць ніякай адказнасці не толькі перад кім-небудзь, але і самі перад сабой.

☐ 5) Ручаіна не высыхала ўлетку, не вымярзала ўзімку.

**А9. Адзначце пары слоў, якія з'яўляюцца паронімамі:**

☐ 1) вусны – губы
☐ 2) карысны – шкодны
☐ 3) кемлівы – някемлівы
☐ 4) напорысты – упарты
☐ 5) яблыневы – яблычны

**А10. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх характарыстыкай. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| А. *Няспешна* ісці – *нетаропка* ісці | 1. Сінонімы |
| Б. *Красамоўніцкі* талент – *красамоўны* чалавек | 2. Антонімы |
| | 3. Паронімы |
| В. Бегчы *ўверх* – бегчы *ўніз* | 4. Амонімы |

☐ 1) А3Б1В2
☐ 2) А4Б2В2
☐ 3) А1Б2В3

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

☐ 4) А1Б3В2
☐ 5) А1Б2В4

**В1. Закончыце фармулёўку:**

Блізказначныя словы і выразы, якія абазначаюць адно і тое ж паняцце, але адрозніваюцца адценнямі значэння або стылістычный афарбоўкай – гэта ☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В2. У словазлучэнні <u>*радавацца* штодня</u> выдзеленае курсівам слова замяніце антонімам. Адказ запішыце.**

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В3. У словазлучэнні <u>незаслужаная павага</u> назоўнік замяніце антонімам. Адказ запішыце.**

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В4. Знайдзіце сярод прыведзеных пар слоў паронімы. Адказ запішыце.**

1) ёмісты – ёмкі
2) павысіць – панізіць
3) жуда – спалох
4) якраз – менавіта
5) спякотны – марозны

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В5. Вызначце дамінанту ў сінанімічным радзе слоў і запішыце гэтае слова:**

Вагацца, гайдацца, ківацца, хістацца, калыхацца.

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В6. Знайдзіце сярод прыведзеных пар слоў сінонімы. Адказ запішыце.**

1) злева – справа
2) абязводзець – абязводзіць
3) заклік – покліч
4) гадавальнік – гадаванец
5) старт – фініш

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В7. Знайдзіце сярод прыведзеных пар слоў паронімы. Адказ запішыце.**

1) арэшнік – ляшчыннік
2) прывітальны – развітальны
3) вучыць – навучаць
4) гнеўны – гняўлівы
5) абрывісты – стромы

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В8. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх характарыстыкай. Адказ запішыце.**

| | |
|---|---|
| А. *Чыгуначны* мост – *чыгунная* лаўка | 1. Сінонімы |
| Б. Зачыніць *шчыльна* – прымыкаць *ушчыльную* | 2. Антонімы |
| В. *Наступальная* аперацыя – *абарончы* план | 3. Паронімы |
| | 4. Амонімы |

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

## ТЭСТ 4
### ЛЕКСІКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПАВОДЛЕ СФЕРЫ ЎЖЫВАННЯ І ПАВОДЛЕ ПАХОДЖАННЯ

**А1. Адзначце запазычаныя словы:**

☐ 1) днушка
☐ 2) пакуць
☐ 3) інтэр'ер
☐ 4) вахта
☐ 5) каледж

**А2. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца запазычанымі:**

☐ 1) Чыста мыцца – наша *ўмова*, той, хто чысты – той здаровы.

☐ 2) Сонца свет памаладзіла, паглядзі, ён стаў які, дзе *чароўнае* свяціла промні пырснула ў бакі.

☐ 3) Балота займае велізарную плошчу, *валок* на дзесяць.

☐ 4) Я смутак, быццам птушку, схаваю ад людзей і буду ціха *гушкаць* святло сваіх надзей.

☐ 5) У цяпліцы хвоя была раскладзена на *стэлажы*, у ёй падтрымлівалася нізкая, але роўная тэмпература.

**А3. Адзначце словы, якія адносяцца да лексікі абмежаванага ўжытку:**

☐ 1) шанаваць
☐ 2) зімны
☐ 3) нацянькі
☐ 4) пругкі
☐ 5) планктон

**А4. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы адносяцца да лексікі абмежаванага ўжытку:**

☐ 1) раскладанне *вентара*
☐ 2) *каласістае* жыта
☐ 3) *старшыня* сходу
☐ 4) гаршчок *грушы*
☐ 5) *бураковы* ліст

**А5. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы адносяцца да дыялектнай лексікі:**

☐ 1) *учваны* голас
☐ 2) *аладыш* з квасам
☐ 3) *гэнае* слова
☐ 4) *марфалогія* раслін
☐ 5) *стаўбун* малака

**А6. Адзначце сказы, у якіх ужыты дыялектныя словы:**

☐ 1) Сярод вудароў нямала дзяўчат, і такое рыбацкае захапленне мяне нават трошкі здзівіла.

☐ 2) Страх нападае на душу падарожніка, якога захопіць кудаса ў дарозе.

☐ 3) Імкліва-хутка дні ляцяць, назад у снах адно вяртаюцца: то весналіста шалясцяць, то жаўталіста асыпаюцца.

☐ 4) Калі над Полацкам зіма засцеле снежныя абрусы, тады гісторыя сама гаворыць з краем беларускім.

☐ 5) Селянін рухава патрухаў да сваіх саней, узбіў салому, каб латвей было сядзець, паклаў чамаданы.

**А7. Адзначце словы, якія адносяцца да спецыяльнай лексікі:**

☐ 1) кагадзе
☐ 2) пігмент
☐ 3) галаграфія
☐ 4) стаеннік
☐ 5) паняверка

**А8. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленае слова адносіцца да спецыяльнай лексікі:**

☐ 1) сустракаць *прадвесне*
☐ 2) вялікая *імшара*
☐ 3) накасіць *вішы*
☐ 4) падрыхтоўка *менеджэраў*
☐ 5) сардэчная *арытмія*

**А9. Адзначце ўстарэлыя словы:**

☐ 1) вакацыі
☐ 2) астэатамія
☐ 3) крамольнік
☐ 4) копанка
☐ 5) шыба

**А10. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленае слова з'яўляецца ўстарэлым:**

☐ 1) зараснікі *сунічніку*
☐ 2) назбіраць *варушак*
☐ 3) *леташняя* трава

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

☐ 4) *браная* коўдра
☐ 5) *пругкі* мяч

**А11. Адзначце сказы, у якіх ужыты ўстарэлыя словы:**

☐ 1) І ў Бога прашу бласлаўлення, каб ён між усіх сваіх спраў даў роднаму слову натхненне, жыццё яму веснае даў.

☐ 2) І бег народ, бы ў час паморку, закрыўшы вочы, у белы свет.

☐ 3) Калі ўсе згублены ключы, калі ні шанцу, анічога – усё ж ідзі, любі, крычы і пасягай на перамогу.

☐ 4) Вясёлка над Белай Руссю – гэта мая мара, ляцяць пад вясёлку гусі, нібы пад вянец, па парах.

☐ 5) Так пачалося для Данілы жыццё астрожніка ў турме…

**А12. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і іх характарыстыкай. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| **А.** Ліцэй | 1. Спецыяльнае слова |
| **Б.** Куліда | 2. Дыялектнае слова |
| **В.** Лёкай | 3. Устарэлае слова |
| | 4. Запазычанае слова |

☐ 1) А3Б1В2
☐ 2) А4Б3В2
☐ 3) А1Б2В4
☐ 4) А2Б4В1
☐ 5) А4Б2В3

**В1. Закончыце фармулёўку:**

Словы, якія ўжываюцца на пэўнай тэрыторыі, у дыялектах і гаворках – гэта лексіка

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В2. Знайдзіце запазычанае слова і запішыце яго:**

1) ночвы
2) парахня
3) заціркa
4) спідометр
5) сунічнік

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В3. Падбярыце да запазычанага слова *дысіміляцыя* беларускі адпаведнік і запішыце яго.**

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В4. Знайдзіце ў сказе запазычанае слова. Падбярыце да яго беларускі адпаведнік і запішыце ў пачатковай форме.**

У гэтых спрэчках Васіль выступаў арбітрам.

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В5. Знайдзіце словазлучэнне з дыялектным словам і запішыце гэтае слова ў пачатковай форме:**

1) марныя ілюзіі
2) стаўбунаватая шапка
3) споведная кніга
4) бальны танец
5) працаваць на цагельні

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В6. Падбярыце да выдзеленага дыялектнага слова літаратурны адпаведнік і запішыце яго ў пачатковай форме.**

Паміж леташніх лістоў чырванее *асавік*, а за ім – кароль грыбоў, сам магутны баравік.

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В7. Знайдзіце ў сказе дыялектнае слова. Падбярыце да яго літаратурны адпаведнік і запішыце ў пачатковай форме.**

На дварэ сутонела, неба страчвала сваю празрыстасць.

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В8. Знайдзіце ўстарэлае слова і запішыце яго:**

1) стыднік
2) падваліна
3) картэж
4) флексія
5) васпан

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В9. Падбярыце да выдзеленага ўстарэлага слова сучаснае літаратурнае і запішыце яго ў пачатковай форме.**

Ці хто здалёк прыбыў, ці зблізку, які б вас вецер ні прынёс – вам Камароўку ў *стольным* Мінску не абмінуць, бы ўласны лёс.

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В10. Знайдзіце ў сказе ўстарэлае слова. Падбярыце да яго сучаснае літаратурнае і запішыце ў пачатковай форме.**

У зале, у вялікай жырандолі, гарэла з дзесятак свечак.

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

**В11. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і іх характарыстыкай. Адказ запішыце.**

| | |
|---|---|
| **А.** Наўперад | 1. Устарэлае слова |
| **Б.** Алгарытм | 2. Дыялектнае слова |
| **В.** Дарэктар | 3. Спецыяльнае слова |
| | 4. Запазычанае слова |

☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐☐

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

## АДКАЗЫ ДА ТЭСТАЎ

**ТЭСТ 1. Лексічнае значэнне і спалучальнасць слоў.**

**А1.** 1, 3, 5. **А2.** 2, 3, 5. **А3.** 2, 4, 5. **А4.** 3, 5. **А5.** 1, 2, 4. **А6.** 2, 3, 5. **А7.** 3, 4, 5. **А8.** 1, 2, 5. **А9.** 1, 3. **А10.** 2. **В1.** Лексікалогія. **В2.** Цырульня. **В3.** Грунтоўны адказ. **В4.** Парусная лодка. **В5.** Прадвесце падзеі. **В6.** А5Б1В3Г2.

**ТЭСТ 2. Адназначныя і мнагазначныя словы. Амонімы. Прамое і пераноснае значэнні слова.**

**А1.** 1, 3. **А2.** 1, 4, 5. **А3.** 1, 2. **А4.** 2, 3, 4. **А5.** 1, 3, 4. **А6.** 1, 2, 5. **А7.** 3, 4. **А8.** 1, 3, 4. **А9.** 1. **А10.** 1, 2, 4, 5. **А11.** 2, 5. **В1.** Амонімы. **В2.** Гарачая спрэчка. **В3.** Востры аловак. **В4.** Нежывое святло. **В5.** Музыка.

**ТЭСТ 3. Антонімы. Сінонімы. Паронімы.**

**А1.** 1, 3, 5. **А2.** 1, 5. **А3.** 2, 4. **А4.** 1, 3. **А5.** 2. **А6.** 4, 5. **А7.** 2, 3, 5. **А8.** 1, 4. **А9.** 5. **А10.** 4. **В1.** Сінонімы. **В2.** Сумавацъ. **В3.** Знявага. **В4.** Ёмісты – ёмкі. **В5.** Хістацца. **В6.** Заклік-покліч. **В7.** Гнеўны-гняўлівы. **В8.** А3Б1В2.

**ТЭСТ 4. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання і паводле паходжання.**

**А1.** 3, 4, 5. **А2.** 5. **А3.** 2, 5. **А4.** 1, 4. **А5.** 3, 5. **А6.** 1, 2, 5. **А7.** 2, 3. **А8.** 4, 5. **А9.** 1, 3. **А10.** 4. **А11.** 2, 5. **А 12.** 5. **В1.** Дыялектная. **В2.** Спідометр. **В3.** Распадабненне. **В4.** Суддзя. **В5.** Стаўбунаваты. **В6.** Падасінавік. **В7.** Змяркацца. **В8.** Васпан. **В9.** Сталічны. **В10.** Падсвечнік. **В11.** А2Б3В1.

Падрыхтавалі
**Павел МІХАЙЛАЎ,**
**Святлана ФАЦЕЕВА.**